# Курскія ростані Якуба Коласа

**На абсягах расійскай Куршчыны ўжо больш як тры з паловай стагоддзі месціцца невялікі гарадок Абаянь. Як і любое іншае паселішча, ён мае сваю, адметную гісторыю, знітаваную з падзей розных перыядаў і прозвішчаў знакамітых землякоў ды людзей, што сваёй працай і ведамі ўслаўлялі тамтэйшы край. Ёсць сярод іх і блізкае кожнаму з нас імя Якуба Коласа. Якім чынам аўтар «Новай зямлі» і іншых геніяльных твораў трапіў туды? Калі гэта адбылося? І як яму там жылося?**
**Падчас завочнай праз пандэмію вандроўкі ў мясціны, якія больш як сто гадоў таму прытулілі беларускага класіка, мы паспрабавалі знайсці адказы на гэтыя і некаторыя іншыя пытанні.**

Як і любая іншая, Першая сусветная вайна касцяжыла лёсы не толькі на фронце. Істотны негатыў яна прыўносіла і ў жыццё тых, хто быў далёкі ад вайсковай службы. Вестка пра пачатак супрацьстаяння з Германіяй, якое затым разгарэлася ў пажар планетарнага маштабу, застала Якуба Коласа ў Вільні: разам з цяжарнай жонкай ён гасцяваў у цешчы. Пакуль баявыя дзеянні разгортваліся ў далечыні ад Беларусі, вялікай трывогі яны ў іх сям'і не выклікáлі. Тым больш 31-гадовага паэта, прызванага ў канцы жніўня ў Серпухоўскі полк, што дыслацыраваўся ў Мінску, праз зусім кароткі час адпусцілі дадому – настаўнікам далі часовую адтэрміноўку ад прызыву. Ён адразу ж паехаў на месца сваёй працы, у Пінск. У палескай сталіцы, дзе 30 верасня нарадзіўся ягоны першынец Даніла, Колас правёў увесь наступны навучальны год.

На пачатку лета 1915 года настаўнік 3-га Пінскага прыходскага вучылішча К. Міцкевіч на школьныя вакацыі зноў выехаў з сям'ёй да сваякоў жонкі. На гэты раз Вільня была зусім іншая. Асаблівы неспакой у яе жыхароў выклікалі падзеі на Заходнім фронце, якія пад напорам германскіх войск з пачатку жніўня імкліва набліжаўся да горада. Многія гараджане далучаліся да плыні бежанцаў, што дзень пры дні бесперапынна рухалася на ўсход. Калі стала відавочна, што ўлады і армія рыхтуюцца да магчымай здачы Вільні ворагу (яскравым сведчаннем быў дэмантаж на Кафедральнай плошчы і вываз у глыб Расіі бронзавага манумента Кацярыны II), пра ад'езд задумаўся і Якуб Колас. «Пачалося цяжкое для краіны бежанства, – дзяліўся ён пазней успамінамі з пісьменнікам Максімам Лужаніным. – Падняліся і мы з Марыяй Дзмітраўнай. Брат



Якуб Колас. Пачатак 1920-х гадоў

яе прыслаў пісьмо: перабірайцеся ў Маскоўскую губерню. Там мы і ўладзіліся абое…».

Я. Коласу і яго жонцы ўдалося ўладкавацца на працу настаўнікамі ў земскае вучылішча ў сяле Старыкава, за




Такой бачыў вуліцу Курскую ў Абаяні Якуб Колас. Фота 1915 года



Мала што змянілася на вуліцах Абаяні з часоў Якуба Коласа

100 кіламетраў на поўнач ад сучаснай расійскай сталіцы (цяпер – Талдомскі раён Маскоўскай вобласці). Але «гэта свята было кароткае. Дзён пяць я толькі пранастаўнічаў. На пачатку верасня мабілізавалі і залічылі ў 55-ы пяхотны батальён, у самой Маскве. Батальён быў запасны… Хадзіў я спачатку на палявыя заняткі. Потым узводны вызваліў. Пасадзіў складаць і бясконца перапісваць спісы асабовага складу», – чытаем далей успаміны песняра, выкладзеныя М. Лужаніным у яго кнізе «Колас расказвае пра сябе».

У пачатку 1916 года адбыўся новы паварот у вайсковай кар’еры паэта: яго адкамандзіроўваюць у Аляксандраўскае ваеннае вучылішча, што таксама размяшчалася ў Маскве. Праз чатыры месяцы вучобы па паскоранай праграме прапаршчык К. Міцкевіч апынуўся ў Пярмі, у 162-м запасным палку. Гэтую вайсковую часць чамусьці не спяшаліся накіроўваць на захад, у зону баявых дзеянняў расійскай арміі, і Я. Коласу было дазволена «выпісаць» да сябе жонку з двухгадовым сынам. Калі аддалі загад на перадыслакацыю, паэт, якому на той час прысвоілі званне падпаручніка, пайшоў з паклонам да камандавання, і яму пайшлі насустрач: «Мы чакалі прыбаўлення сям’і, і мяне не накіравалі на фронт. Адпрасіўся, пакуль не нарадзіўся Юрка…».

І ўсё ж радасць свайго «другога бацькоўства» Я. Колас адчуваў нядоўга. «25 ліпеня (1917 года, калі сыну Юрку не споўнілася і трох месяцаў. – *Аўт.*) прызначылі мяне начальнікам эшалона дэзерціраў. Загадалі везці іх на Румынскі фронт. Зноў дрыжы: паразбягаюцца, а ты адказвай па законах ваеннага часу… Прасіў іх: «Не ўцякайце толькі, хлопцы! Пачакайце, пакуль прыедзем на пазіцыю!» Паслухалі. Я больш-менш у парадку здаў сваю быстраногую каманду».

– У Румыніі Якуба Коласа напаткаў чарговы ўдар лёсу, – расказвае ўнучка народнага песняра Вера Міцкевіч, якая займаецца вывучэннем свайго радаводу. – Знаходзячыся на пазіцыях 282-га Александрыйскага палка каля горада Ваксо, ён моцна захварэў. Адразу наваліліся, як сам згадваў, усе хваробы: жаўтачка (жаўтуха), калаціла малярыя, пачыналіся сухоты. З гэтай прычыны дзеду далі доўгатэрміновы адпачынак, і ён паехаў да сваёй сям’і, жонкі і сыноў, якія на той час, сярэдзіну верасня, ужо знаходзіліся ў Абаяні, невялікім павятовым гарадку Курскай губерні.

## Чаму Абаянь?

Як у жыцці народнага паэта ўзнікла Абаянь? Яго ўнучка, спасылаючыся на архіўныя дакументы і ўспаміны сваіх родных, даводзіць, што гэты горад на час бежанства яшчэ ў 1915 годзе, калі маладыя Міцкевічы падаліся ў падмаскоўнае Старыкава, абрала маці Марыі Дзмітраўны – таксама Марыя. Сюды яна прыехала з адным са сваіх сыноў Аляксандрам і зводнай сястрой Кацярынай Кукін. А пасля таго як Коласа накіравалі на Румынскі фронт, да іх пераехала і яго жонка з малымі.

У сярэдзіне 1917-га Абаянь знаходзілася ў глыбокім тыле. Горад быў моцна перанаселены бежанцамі.

**Настаўнічаць Я. Коласу ў абаянскім краі давялося не толькі ў Малых Круках. Кожны новы навучальны год «прыводзіў» яго на новае месца.**

Паводле розных ацэнак, з 14 тысяч яго тагачасных жыхароў каля паловы маглі складаць «эмігранты». Хаця мясцовая прамысловасць і налічвала нейкі дзясятак невялікіх заводаў – тры сінельныя, два гарбарныя, васковы, салатопны, маслабойны, мядоваварыльны і мукамольны, працоўнага занятку для ўсіх не хапала. Асноўным жа рухавіком «абаянскага прагрэсу» ў той перыяд з'яўляўся гандаль, а дакладней, бартар – абмен прадуктаў на рэчы. Зразумела, што рынкавая наменклатура была невялікай, таму пэўная частка гараджан адчувала нястачу, жыла надгаладзь.

### У Абаяні Якуб Колас ледзь не стаў… дзянікінцам.

Швагру Я. Коласа Аляксандру Каменскаму, выпускніку Жыровіцкага духоўнага вучылішча і Казанскага ўніверсітэта, удалося ўладкавацца настаўнікам у адну з абаянскіх навучальных устаноў. Яго заробку з большага хапала на ўтрыманне сям'і. Калі ж незадоўга да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Абаяні з'явіўся Я. Колас, ён спыніўся ў Каменскіх, якія, як мяркуецца, здымалі жыллё ў адным з сядзібных дамоў на Манастырскай вуліцы (цяпер 1 Мая). Крыху падлячыўшыся, паэт усё ж вырашыў адасобіцца ад сваякоў. Знайшоў здымны куток на 1-й Знаменскай вуліцы (назва паходзіла ад суседняй з горадам вёскі Знаменка, цяпер гэта вуліца імя Жукава) і перасяліўся туды з жонкай і сынамі.

– Трэба было неяк утрымліваць сям'ю, і на пачатку студзеня 1918 года, пасля таго як у Абаяні трывала ўсталявалася савецкая ўлада, дзед звярнуўся ў павятовы аддзел народнай асветы з просьбай прызначыць яго на працу настаўнікам, – працягвае Вера Міцкевіч. – Але трапіць у якую-небудзь абаянскую школу не выпадала. Была ўжо сярэдзіна навучальнага года, і ўсе настаўніцкія пасады ў горадзе аказаліся занятыя. Я. Коласу прапанавалі паехаць у вёску і далі на выбар некалькі вакантных месцаў. Канстанцін Міхайлавіч аддаў перавагу школе ў Малых Круках. Бо вёска была бліжэй, чым іншыя, да Абаяні – за 11 кіламетраў, а тамтэйшая школа мела асобны пакой для настаўніка. Можна было час ад часу наведваць сям'ю, а навесну ён наогул планаваў перавезці жонку з дзецьмі да сябе. Дый заробак абяцалі не такі і благі. У 1970-х гадах літаратуразнаўцу Сцяпану Александровічу ўдалося адшукаць архіўны дакумент аб дэклараванай настаўніку Малакрукоўскай школы К. Міцкевічу месячнай заработнай плаце. Яна складалася з грашовай долі ў 81 рубель 10 капеек і хлебнага пайка ў разліку 50 фунтаў пшаніцы на дарослага члена сям'і і 5 фунтаў на дзяцей да 6 гадоў. Такім чынам, выходзіла 110 фунтаў – гэта каля 50 кілаграмаў. Праўда, ці атрымліваў Я. Колас абяцанае, застаецца загадкай. Бо з яго успамінаў вымалёўваецца зусім іншая карціна: «Жылі мы на адной бульбе. На цэлы тыдзень мелі мы на чатыры душы 21 бульбіну. Я падаў ад знясілення. Селянін у Круках раз накарміў мяне і даў з сабою кавалачак сала. Вялікае свята я прынёс таго вечару дадому…»

Настаўнічаць Я. Коласу ў абаянскім краі давялося не толькі ў Малых Круках. Кожны новы навучальны год «прыводзіў» яго на новае месца. Так у працоўнай біяграфіі паэта з'явіліся яшчэ школы ў вёсках Другі Ліпавец, Рудавец, Якаўлеўка. Звязана гэта было з тым, што кіраўніцтва павятовага адукацыйнага ведамства надзвычай цаніла у ім, як былым вайскоўцу, высокі прафесіяналізм і арганізатарскія здольнасці. Менавіта таму раз за разам атрымліваў ён адтэрміноўку ад вайсковай службы і накіроўваўся на чарговы «прарыў». І ўсюды былі свае праблемы, вырашаць якія даводзілася часам самымі нетрывіяльнымі спосабамі.

## Малыя Крукі і Другія Ліпаўцы

Найменш клопатаў было якраз на першым месцы працы. Да падзей рэвалюцыйнага кастрычніка 1917 года Малакрукоўская школа лічылася царкоўна-прыходскай. Пасля таго як савецкая ўлада аддзяліла царкву ад дзяржавы, мясцовы святар не пакінуў будынак без нагляду, сваім аўтарытэтам збярог яго ад разрабавання. Таму новапрызначанаму настаўніку прыйшлося толькі абысці вёску і паклікаць дзяцей на вучобу. Праўда, навучанне давялося прыпыняць, бо наступалі кайзераўскія войскі. Парушыўшы ўмовы Брэст-Літоўскага мірнага дагавора, яны спачатку акупіравалі Украіну, а ўжо адтуль праз суседнюю Белгародчыну трапілі на Куршчыну: 17 красавіка ў ліку іншых паселішчаў занялі і Абаянь. Але праз два дні Чырвоная армія здолела выгнаць ворага з горада. Аднавілася дзейнасць савецкіх устаноў, у тым ліку і школы ў Малых Круках.

У Другім Ліпаўцы, дзе Я. Коласу давялося настаўнічаць у 1918–1919 навучальным годзе, была зусім іншая сітуацыя. У гэтай самай далёкай вёсцы сярод усіх, дзе яму давялося працаваць (размешчана за 45 кіламетраў ад Абаяні і паводле сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Курскай вобласці адносіцца да Медвенскага раёна), валасны выканкам выдзеліў пад школу прасторную сялянскую хату «на два канцы», якая пуставала. На настаўніка ўсклалі абавязкі не толькі



На галоўнай плошчы Абаяні – плошчы Леніна – адзіны, хто «памятае» беларускага песняра, – Свята-Троіцкі праваслаўны сабор

запоўніць яе вучнямі, але і знайсці парты, стол, сшыткі, падручнікі, чарніла, ручкі і пёры да іх, а таксама завезці дровы для ацяплення. Усё гэта яму ўдалося зрабіць, і заняткі пачаліся ў вызначаны тэрмін – 1 лістапада. У меншай частцы дома Я. Колас уладкаваў для сям'і пакой: з Абаяні пераехала Марыя Дзмітраўна з дзецьмі.

**Нягледзечы на побытавыя нягоды і неабходнасць пастаянна думаць пра хлеб надзённы, у Абаяні Я. Колас увасабляў і творчыя памкненні сваёй душы.**

Праз колькі тыдняў выйшла неспадзяванка: большасць вучняў перасталі хадзіць у школу, бо надышлі маразы, а дзеці не мелі цёплага абутку і адзення. Настаўнік прапанаваў выйсце: вяскоўцам, чые дзеці наведвалі заняткі, прынесці хлебных сухароў, хто колькі зможа. Сабралі некалькі скрынак. Іх па пошце адправілі ў адну з маскоўскіх школ з просьбай прыслаць узамен адзенне і абутак. І масквічы адгукнуліся. Даслалі хоць і паношаныя рэчы, але яны дапамаглі ліпавецкім вучням перажыць суровую зіму.

У 1919–1920 навучальным годзе Я. Колас працаваў у вёсцы Рудавец. Месца ў тамтэйшай школе яму, так бы мовіць, выгарала выпадкова. У самы разгар грамадзянскай вайны Куршчыну і прылеглыя да яе тэрыторыі занялі войскі Дзянікіна. Уся навучальная дзейнасць, як і іншыя сферы, была паралізавана. А паэт, які з сям'ёй тым часам кватараваў у Абаяні, ледзь не стаў… дзянікінцам. Новая гарадская адміністрацыя выдала загад прызваць яго як паручніка царскай арміі. Але своечасова папярэджаны Колас разам з суседам, таксама былым вайскоўцам, вырашыў адсядзецца ў схроне. Позняй восенню ўлада ў Абаяні ў чарговы раз памянялася, і будучы народны пясняр Беларусі зноў стаў запатрабаваны на настаўніцкай ніве. Яго перавялі ў Рудавец, што знаходзіўся ўсяго за некалькі кіламетраў ад павятовага цэнтра – пасля дзянікінскай акупацыі ў вёску не вярнулася мясцовая настаўніца. Днём Канстанцін Міхайлавіч праводзіў урокі, а пад вечар выпраўляўся да сям'і ў горад. Падчас штодзённай хадзьбы ён падхапіў «іспанку» – вірус грыпу, які лютаваў тады ў свеце не менш, чым сучасная пандэмія. На шчасце, хваробу ўдалося адолець.

Неўзабаве Я. Коласа нечакана выклікалі ў павятовы аддзел народнай асветы. Нагода на тое была асаблівая: для наладжвання кантролю за работай школ і практычнай дапамогі настаўнікам ствараўся інструктарскі аддзел, пасаду ў якім і прапанавалі Канстанціну Міхайлавічу.

– Дзядулю даручылі інспектаваць школы Альшанскай і Пярэсыпскай валасцей. Там налічвалася два з паловай дзясяткі розных навучальных устаноў, – расказвае Вера Міцкевіч. – Ён спачатку вагаўся, бо добра ведаў, што давядзецца мала спыняцца дома. Але затым паставіў умову, каб працаўладкавалі бабулю ў адной са школ на

тэрыторыі падведамасных яму валасцей. Так у жыцці Якуба Коласа з'явілася яшчэ і вёска Якаўлеўка з самай праблемнай у яго настаўніцкай біяграфіі школай...

## Каб жыць па-панску

У Я. Коласа, канечне ж, была магчымасць выбраць для жонкі найлепшае з магчымых працоўных месц. Аднак ён спыніўся на Якаўлеўцы, бо пад школу там адвялі былую панскую сядзібу, якую гады са два таму ён наведваў. Канстанцін Міхайлавіч меркаваў, што ў прасторным будынку хопіць месца ўсім: і вучням, і яго сынам-жэўжыкам, якія, па сутнасці, ніколі і не жылі ў нармальных побытавых умовах. Але, прыехаўшы ў вёску, паэт расчараваўся ў сваім выбары. Маёнтак было не пазнаць: вокны зеўралі выбітымі шыбамі, дзверы адсутнічалі наогул, у пакоях усё дагары нагамі. Да таго ж у валвыканкаме выявілася: Якаўлеўская школа існуе толькі на паперы, яе толькі збіраліся стварыць. І пакуль кіраўніцтва думала-гадала, мясцовыя сяляне пасля ад'езду ўладальнікаў, паноў Самбурскіх, учынілі ў сядзібе поўны разгром. Паэту зноў давялося закасваць рукавы: трэба было надаць будынку больш-менш прымальны выгляд, знайсці школьны інвентар. Пры гэтым ад інспектарскіх абавязкаў ніхто яго не вызваліў.


№ 30/1821
УДОСТОВЕРЕНИЕ
Дано сие т. МИЦКЕВИЧУ КОНСТАНТИНУ в том, что он следует вместе со своею семьей из г. Обояни в г. Минск в распоряжение Наркомпросбела.
Просьба ко всем советским учреждениям и должностным лицам оказывать т. МИЦКЕВИЧУ всяческое содействие при его передвижении.
Зам. Наркомпросбел
Секретарь

Пасведчанне аб садзейнічанні Я. Коласу, выдадзенае на час пераезду ў Мінск


Телеграмма
Москва Наркомпросу Луначарскому
убедительная просьба телеграфно предписать Обоянскому Курской губернии Уотнаробразу немедленно откомандировать в распоряжение Наркомпроса Белоруссии Школьнаго Инструктора КОНСТАНТИНА МИЦКЕВИЧА псевдоним ЯКУБ КОЛОС одного из лучших белорусских писателей точка. Все просьбы до сих пор безрезультатны точка Белорусска Республика вправе желать чтоб ее поэты вернулись к ней и могли посвятить себя своему призванию
Замнаркомпросбел

Копія тэлеграмы Наркамасветы БССР народнаму камісару РСФСР А. Луначарскаму з просьбай «тэлеграфна прадпісаць» Абаянскаму павятоваму аддзелу адукацыі камандзіраваць Я. Коласа ў Беларусь

Рамонтная эпапея доўжылася амаль два месяцы. Затое школа глядзелася як лялька. Задаволена была і Марыя Дзмітраўна. Яна пераехала ў Якаўлеўку і адразу распачала заняткі. Хутка выявілася, што сялянская кемлівасць, якой Якуб Колас кіраваўся, выбіраючы працоўнае месца для жонкі, яго не падвяла. Каля маёнтка Міцкевічы разбілі гарод, які потым ратаваў іх, галодных, бо на Куршчыне летам 1920-га панавала сухмень. У той год паэт купіў дзве казы, якім, нягледзечы на засуху, было што есці ў былым панскім садзе. Вольніца была там і малым Юрку і Данілу. Словам, побыт сям'і аказаўся больш-менш уладкаваным.

Да ўсяго прыйшла радасная вестка з радзімы. Канстанцін Міхайлавіч атрымаў афіцыйны выклік вярнуцца ў Беларусь для працы ў сістэме Народнага камісарыята асветы БССР. Пра такую нагоду ён марыў ці не ўвесь час у Абаяні. Аднак павятовае начальства ад такой навіны ў захапленні не было, і паэт не атрымаў дазволу на ад'езд. У хуткім часе карты зблытала яшчэ і хвароба Марыі Дзмітраўны, якая недзе падхапіла сыпны тыф. Дый набліжалася зіма, і як у холад выбірацца з малымі дзецьмі ў дарогу?.. Вяртанне дадому давялося адкласці да вясны.

## Доўгая дарога

Вясной 1921 года наркамасветы БССР зноў дасылае Абаянскаму павятоваму аддзелу народнай асветы ліст-выклік аб вяртанні паэта на радзіму. Але там па-ранейшаму ўпарцяцца. Тады дэпеша са скаргай на неапраўданую затрымку з адкамандзіраваннем паэта ў Беларусь накіроўваецца ў Курскі губернскі аддзел народнай асветы. «Наркомпросбел обращает ваше внимание на то, что Белорусская Республика вправе желать видеть лучших своих культурных деятелей у себя, работающими согласно их призванию, и что совершенно недопустимо при бедности Белоруссии такими выдающимися работниками, задерживать их вне пределов Белоруссии», – гаварылася ў тэлеграме з Мінска. Адначасова была накіравана просьба народнаму камісару РСФСР А. Луначарскаму «телеграфно предписать Обоянскому Курской губерни уотнаробразу немедленно командировать в распоряжение Наркомпроса Белоруссии школьного инструктора Константина Мицкевича, псевдоним

**Каб атрымаць дазвол абаянскіх улад на пераезд Якуба Коласа ў Мінск, давялося звяртацца да народнага камісара А. Луначарскага.**

Якуб Колас, одного из лучших белорусских писателей. Все просьбы до сих пор безрезультатны. Белорусская республика вправе желать, чтоб ее поэты вернулись к ней и могли посвятить себя своему призванию». Саўнаркам БССР хадайнічаў аб выдзяленні для пераезду Я. Коласа і яго сям'і ў Беларусь вагона-цяплушкі. У Абаянь для вырашэння ўсіх пытанняў прыехаў спецыяльны прадстаўнік Наркамасветы БССР Астап Дзянішчык.

– Гэтыя захады нарэшце далі плён, – падсумоўвае Вера Міцкевіч. – Для пераезду выдзелілі таварны вагон, праўда, моцна забруджаны гноем, бо выкарыстоўваўся раней для перавозкі коней. Бабуля са сваёй мамай і братам Аляксандрам два дні яго адмывалі, толькі пасля пагрузілі няхітры скарб дзвюх сямей, а таксама коз – белую рагатую і чорную бязрогую. Яны ратавалі ад голаду малых Міцкевічаў у Абаяні, карміліі яны іх малаком і ў Мінску аж да 1924 года...

Дарога дадому заняла каля тыдня. «На радзіму мы вярталіся праз Маскву. Чыгунка моцна пацярпела ў час грамадзянскай вайны, ехалі доўга і марудна. Запомніліся разбітыя эшалоны, якія ляжалі пад адхонамі, – вынікі шматлікіх крушэнняў. Некалькі дзён вагон стаяў на тупіках Маскоўскага чыгуначнага вузла», – згадваў у сваіх успамінах старэйшы сын песняра Даніла Міцкевіч.

15 мая 1921 года Якуба Коласа ўрачыста сустракалі ў Мінску. Праз чатыры дні ў Беларускім рабочым клубе наладзілі, як паведамляла газета «Савецкая Беларусь», «ўрачыстае спатканне вярнуўшагася з Расеі пасля доўгіх гадоў разлукі з Бацькаўшчынай Якуба Коласа, вядомага беларускага песняра і пісьменніка»… Для Коласа распачаўся новы жыццёвы і творчы этап.

Нягледзечы на побытавыя нягоды і неабходнасць пастаянна думаць пра хлеб надзённы, у Абаяні Я. Колас увасабляў і творчыя памкненні сваёй душы. Там ён працягваў працу над асобнымі раздзеламі паэм «Новая зямля» і «Сымон-музыка», напісаў каля двух дзясяткаў вершаў, алегарычныя апавяданні «Чортаў камень» і «Стары лес», замалёўкі для дзяцей «Страшнае спатканне» і «Рыбакі», нарыс «З Румынскага фронту». У Мінску ён неаднаразова звяртаўся да перажытага на Куршчыне. У сярэдзіне 1920-х гадоў з'явіліся апавяданні «Крывавы вір», «Курская анамалія», «Ванька Кудлаты», «Пракурор», «Сяргей Карага», «Дачакаўся», «Туды, на Нёман», замалёўка «У тыле ў Дзянікіна», сюжэты якіх навеяны ўспамінамі пра Абаянь і яе ваколіцы.



**Мемарыяльную шыльду адкрываюць дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская і намеснік кіраўніка адміністрацыі Абаянскага раёна Аляксандр Далжанкоў. 2018 год**

– На гэтай зямлі засталася добрая памяць пра беларускага песняра, – гаворыць былы дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская. – Супрацоўнікі мясцовага краязнаўчага музея ў свой час запісалі ўспаміны людзей, якія ведалі нашага класіка, вучыліся ў яго. Адну з вуліц Абаяні назвалі імем беларускага песняра. У вясковых школах, дзе ён настаўнічаў, дагэтуль праводзяць тэматычныя ўрокі па Коласавай творчасці.

Важнай падзеяй у культурным жыцці горада стала адкрыццё ў верасні 2018 года памятнай дошкі ў гонар Я. Коласа. Паводле слоў суразмоўцы, з такой ініцыятывай выступіў мінскі музей, і абаянцы яе падтрымалі. На гістарычным будынку на вуліцы 1 Мая (былой Манастырскай), у якім неаднаразова бываў паэт па сваіх службовых клопатах і дзе цяпер размяшчаецца ўпраўленне адукацыі Абаянскага раёна, з'явілася мемарыяльная шыльда. Яе аўтар – вядомы скульптар, народны мастак Беларусі Іван Міско. На ёй побач з выявай Якуба Коласа размешчаны тэкст, які нагадвае жыхарам і гасцям Абаяні пра тое, што таленавіты беларускі паэт і педагог Якуб Колас у 1917–1921 гадах у тых мясцінах сярод народа «сеяў разумнае, добрае, вечнае».

***Сяргей ГАЛОЎКА***